**УДК 82.09**

# ФІЛАСОФСКІЯ МАТЫВЫ БЫЦЦЯ Ў КАНТЭКСЦЕ БЕЛАРУСКАЙ «ВАЕННАЙ» АПОВЕСЦІ (М. ГАРЭЦКІ, Я. КОЛАС, К. ЧОРНЫ)

***Т.Р. БАГАРАДАВА***
***(Полацкі дзяржаўны універсітэт)***

*Робіцца аналіз філасофскіх матываў у галіне беларускай літаратуры на прыкладзе разгляду «ваеннай» аповесці ў творчасці М. Гарэцкага, Я. Коласа, К. Чорнага. Даследаванне абумоўлена недастатковай распрацаванасцю аналізу філасофскіх матываў у айчынным літаратуразнаўстве, ідэалагічнымі асаблівасцямі ў разглядзе творчасці асобных аўтараў, у прыватнасці М. Гарэцкага. Робіцца агляд даследаванняў па адзначанай тэматыцы, спроба абгрунтавання мэтазгоднасці даследавання філасофскіх матываў у кантэксце творчасці прыгаданых аўтараў з улікам сучасных падыходаў параўнальна-гістарычнага і тыпалагічнага аналізу. Аб'ектам аналізу даследавання выступае мастацка-філасофская думка, дэтэрмінаваная ў пісьменніцкай практыцы. На падставе разгляду твораў, напісаных у розныя гістарычныя эпохі, робіцца агульны агляд тэндэнцый, якія паслужылі падмуркам для зараджэння беларускай ваеннай прозы, у прыватнасці аповесці. Сучасная беларуская літаратура плённа працягвае пошукі ў галіне адзначанай ваеннай тэматыкі, таму дадзенае даследаванне падаецца актуальным і мэтазгодным у варунках праекцыі на перспектывы адлюстравання чалавечага быцця: сацыяльнай прыроды чалавека і праяў яго існавання.*

**Уводзіны.** Даследаваннем філасофскіх аспектаў у айчынным літаратуразнаўстве пачалі займацца прыкладна ў 80-я гады XX стагоддзя. Адным з першых да гэтага пытання звярнуўся Л. Гаранін. Даследчык прааналізаваў філасофскія аспекты літаратурнага развіцця, гістарычныя формы мастацка-філасофскай думкі, а таксама генезіс жанраў сацыяльна-філасофскай аповесці і рамана ў беларускай літаратуры.

Пры вывучэнні філасофскага аспекту літаратуры даследчык вымушаны аперыраваць двума рознымі метадамі пазнання: прадметна-аналітычным і разумова-сузіральным (адцягненым) з нагоды таго, што «<…> філасофская думка ў літаратурным творы далёка выходзіць за межы эстэтычнай рэальнасці, якая ўзнаўляецца мастаком, і ўрываецца ў сферу тэарэтычнага мыслення, такім чынам, патрабуе спецыяльнага аналізу і ацэнкі»[1] [5, с. 3].

Параўнальна-гістарычны і тыпалагічны аналіз у нашым даследаванні дазваляе спасцігнуць новыя заканамернасці літаратурнага працэсу і разам з тым зразумець заканамернасці развіцця мастацкага вопыту канкрэтнага пісьменніка.

Пытанні філасофскага зместу і форм выражэння знайшлі адлюстраванне ў манаграфіях беларускіх вучоных. Сярод прац дадзенага кшталту варта прыгадаць: А. Адамовіча «Беларускі раман. Станаўленне жанру» (1961), «Кузьма Чорны» (1977), «Літаратура, мы і час: Артыкулы і выступленні» (1979), «Браму скарбаў сваіх адчыняю» (1980); Э. Гурэвіч «Пафас гераізму. Сучасная савецкая проза пра Вялікую Айчынную вайну» (1979); І. Навуменкі «Якуб Колас: духоўны воблік героя» (1981); І. Чыгрына «Паміж былым і будучым: проза Максіма Гарэцкага» (1994); С. Андраюка «Пісьменнікі. Кнігі» (1997); Д. Бугаёва «Максім Гарэцкі» (2003); М. Тычыны «Кузьма Чорны: эвалюцыя мастацкага мыслення» (2004); В. Жураўлёва «Якуб Колас і паэтыка беларускага рамана» (2004) і г.д. Аўтары дадзеных даследаванняў зрабілі грунтоўную працу па вывучэнню філасофскіх аспектаў беларускай літаратуры, аналізу духоўных пошукаў у творчасці М. Гарэцкага, Я. Коласа, К. Чорнага і іншых сучасных аўтараў. Л. Гаранін канстатуе: «Пакуль праблема філасофскіх пошукаў не стала яшчэ прадметам спецыяльнага вывучэння. <…> Тым больш гэта істотна, што развіццё беларускай літаратуры ў канцы XIX – пачатку XX стагоддзя ішло паскоранымі тэмпамі, характарызуючыся суіснаваннем многіх літаратурных напрамкаў і творчых метадаў, што наклала адбітак і на працэсы філасофскіх пошукаў» [5, с. 61]. Кожны з пералічаных аўтараў, што даследуе пэўны аспект развіцця літаратуры, заканамернасці яе станаўлення, звяртаецца да новых форм і сродкаў адлюстравання рэчаіснасці ў дачыненні да грамадска-духоўнай практыкі чалавека. Побач з акрэсленай практыкай звароту да філасофскіх і метадалагічных асноў слоўнага мастацтва паслякастрычніцкай пары (Л. Гаранін) рабіліся пошукі новага творчага метаду, новай канцэпцыі рэчаіснасці (А. Яскевіч); звярталася ўвага на адметнасць выяўлення ў літаратуры характару героя (А. Матрунёнак). У прыватнасці, было падкрэслена, што творчы метад з'яўляецца тым універсальным законам, які вызначае сутнасць мастацкага працэсу пэўнай культурнай эпохі. Даследчыкамі (В. Жураўлёвым, М. Тычынам) раскрыта і паказана заканамернасць унутранай сувязі паміж рэалістычным метадам і магчымасцямі эпічнай структуры, а гі-

[1] Тут і далей пераклад аўтарскі – *Т. Б.*

старызм ацэньваецца імі як дыялектычны прынцып стварэння рэалістычнага характару. Калі разглядаць аспекты літаратурных філасофскіх матываў у кантэксце параўнальна-гістарычнага метаду, то праблема значна ўскладняецца, бо ўступаюць у сілу адпаведныя фактары: развіццё жыцця ў формах самога жыцця, існаванне мастацкай свядомасці, развіццё тэарэтычнай свядомасці. Л. Гаранін робіць акцэнт на існаванні асабістых законаў развіцця ўнутры кожнай з адзначаных сфер. Пры гэтым важна дадаць, што суаднесенасць крытэрыяў каштоўнасці ў кожнай з іх вельмі апасродкаванае.

Задача аналізу развіцця філасофскай думкі ў літаратуры пачала ставіцца Л. Гаранінам упершыню. У наш час складанасць гісторыка-тэарэтычнага аналізу развіцця філасофскай думкі і суаднесеных з ёй праблем стаіць асабліва востра не толькі з нагоды існавання складанасцей метадалагічнага характару, але і з маладаследаванасцю праблемы ў творчасці многіх знакамітых пісьменнікаў наогул. Акрамя таго, адсутнічае акрэсленая лінія філасофскага развіцця літаратуры і ў сувязі з гэтым – аналіз гісторыка-літаратурнага кантэксту. Праблема паглыбляецца несістэмным або недастаткова аб'ектыўным аналізам творчасці некаторых беларускіх аўтараў. Патрабуецца якаснае абгрунтаванне і нават у некаторых выпадках разгляд і перагляд той ці іншай пазіцыі аўтара менавіта ў сучасным літаратурным кантэксце.

**Асноўная частка.** Абставіны філасофскага аналізу патрабуюць прыблізнай фіксацыі, бо яны звязаны з умовамі канкрэтнай гістарычнай эпохі і з прычыны гэтага – разнапланавымі задачамі развіцця літаратуры. Менавіта таму даследчык не можа карыстацца прынцыпамі абсалютнай ісціны, тымі ці іншымі нязменнымі маральнымі і мастацкімі каштоўнасцямі. Адзіным аб'ектам аналізу ў дадзеным выпадку можа выступаць, па вызначэнні Л. Гараніна, мастацка-філасофская думка, «<…> якая адрозніваецца ад уласна мастацкай і ўласна філасофскай тым, што непарыўна звязаная з прынцыпамі вобразнага і паняційнага мыслення адначасова і такім чынам аказваецца суаднесанай з агульным узроўнем і мастацкай, і філасофскай свядомасці сваёй эпохі, выступае як адлюстраванне пэўнай стадыі развіцця гэтай свядомасці» [5, с. 5]. Яна будзе ў адпаведным варыянце прадметнай, а значыць, падуладнай гісторыка-тэарэтычнаму аналізу. Сутнасць тэрміна мастацка-філасофская думка пры фармаванні філасофскай свядомасці заключаецца ў адлюстраванні спецыфічнага віду творчай дзейнасці. Для пісьменніка – гэта спосаб «<…> вырвацца з ціскоў непасрэднай сувязі думкі з вобразам, што абмяжоўваюць яго творчыя магчымасці» [5, с. 6]. Філасофскія пошукі заключаюцца ў адлюстраванні новага прадмета думкі, прынцыпаў яе развіцця, бо яна знаходзіцца ў непасрэднай сувязі з агульным узроўнем мастацка-філасофскай свядомасці эпохі, а таксама з творчым метадам і светаадчуваннем канкрэтнага мастака. Такім чынам, філасофскія пошукі адлюстроўваюць пранікненне літаратуры ў розныя сферы разумовай дзейнасці чалавека, якія знаходзяць адлюстраванне ў змесце і адпаведных вобразных формах. Трэба дадаць, што беларуская «ваенная» аповесць адрозніваецца асаблівай інтэнсіўнасцю філасофскіх матываў, своеасаблівым інтэлектуальным патэнцыялам, перш за ўсё ў адлюстраванні «быційных» пытанняў.

У кантэксце філасофскіх думак пісьменнікаў уяўляецца магчымым аналіз разгляду быцця як сродку адлюстравання асноўных ідэй і прынцыпаў беларускай «ваеннай» аповесці. У «ваеннай» аповесці М. Гарэцкага, Я. Коласа, К. Чорнага дадзены штуршок для развіцця філасофскай плыні ў беларускай літаратуры пры адлюстраванні шматаспектнасці чалавечага існавання ва ўмовах акаляючай рэчаіснасці. Важнай акалічнасцю, што аб'ядноўвае творчасць дадзеных аўтараў, з'яўляецца агульны падыход да разгляду чалавечай асобы як галоўнай самакаштоўнай сілы, што рухае гісторыю, непарыўнай у сукупнасці яе фізічных і духоўных праяў. Л. Гаранін кажа пра сувязь станаўлення мастацка-філасофскай думкі ў беларускай літаратуры дакастрычніцкага і паслякастрычніцкага часу, называючы ў якасці яе новых форм побач з іншымі і суб'ектыўна-філасофскія. Да адзначаных форм і варта аднесці паслякастрычніцкую творчасць М. Гарэцкага, Я. Коласа, К. Чорнага.

Сярод нацыянальных літаратуразнаўчых дасягненняў вылучаюцца тыя, што звязаны з асэнсаваннем твораў на тэмы вайны, партызанскай барацьбы, народнай трагедыі ў гады выпрабаванняў. Не называючы шматлікія гісторыка-літаратуразнаўчыя даследаванні, варта прыгадаць манаграфію В. Жыбуля «Белорусская проза о войне и классическая традиция» (1986), якая вызначаецца параўнальным разглядам абмалёўкі чалавека на вайне ў класічнай і сучаснай літаратуры; даследуючы творы не толькі савецкай, але і еўрапейскай літаратуры, асабліва краін, дзе меў месца рух супраціўлення фашызму і ішла партызанская барацьба (югаслаўская, польская, французская, італьянская літаратуры).

Зыходзячы са сказанага намі праводзіцца разгляд прынцыпаў адлюстравання чалавечага быцця ва ўмовах ваеннай рэчаіснасці з улікам разгляду філасофскіх аспектаў дадзенай праблемы, а таксама ў дачыненні да абмалёўкі вайны згодна з класічнай еўрапейскай традыцыяй. «Зразумела, што разгляд твораў у тыпалагічным плане ўзбуйняў крытэрыі ацэнак і даваў магчымасць яскравей выявіць адметнасць асвятлення тэмы ў нацыянальным мастацтве слова (кнігі В. Каваленкі, М. Тычыны, Г. Тварановіч)» [10, с. 105]. Менавіта В. Каваленка і М. Тычына падкрэсліваюць наяўнасць ярка выражанай нацыянальнай адметнасці ў беларускай літаратуры, яе своеасаблівай «сялянскасці», «народнасці». Улічваючы дадзеныя акалічнасці, варта звярнуць увагу на нацыянальныя адметнасці раскрыцця ваеннай тэматыкі і вылучыць своеасаблівыя рысы беларускай прозы на тэму вайны: увага да вытокаў партызанскага руху; паказ паўсядзён-

насці народнага быцця ва ўмовах супраціўлення («вайна пад стрэхамі»); паказ героя, які выйшаў з народа, і яго ўзвышэння ў часы барацьбы з ворагам; бачанне і асэнсаванне ваеннага быцця вачыма шэраговага яе ўдзельніка і інш.

Звяртаючыся да метадалогіі даследавання філасофскага аспекту ў творчасці прыгаданых намі беларускіх празаікаў, варта адзначыць працу В. Локун «Маральна-філасофскія пошукі беларускай ваеннай і гістарычнай прозы: 1950 – 1960-я гг.» (1995). Адной з традыцый літаратуры было тое, што яна паглыблялася ў сферу філасофіі, канцэнтравала ў сабе праявы духоўнага жыцця грамадства. У творах М. Гарэцкага, Я. Коласа, К. Чорнага фактычна бачныя асновы зараджэння айчыннай філасофскай традыцыі. «<…> Няхай гэтыя мастакі і не стварылі закончанай філасофскай сістэмы, але іх мастацкае слова, якое абапіралася на глыбінную народную філасофію, давала сваё, арыгінальнае тлумачэнне нацыянальнага жыцця» [10, с. 4].

Трэба дадаць, што пра філасофскі аспект як структурную асаблівасць прозы варта казаць значна пазней, адносячы яго да 70 – 80-х гадоў XX стагоддзя. «Звязаны ён галоўным чынам з творчасцю А. Адамовіча, В. Казько, В. Быкава і інш. Па-іншаму цяпер мы разумеем і пэўныя гістарычныя падзеі (калектывізацыя, Вялікая Айчынная вайна), шмат у чым змяніліся акцэнты ў разуменні такіх эстэтычных і маральных катэгорый, як трагічнае і гераічнае, драматычнае і рамантычнае, будзённае і ўзвышанае, жыццё і смерць, дабро і зло, сумленнасць і здрада, свабода і несвабода і г.д.» [10, с. 5].

У літаратурным развіцці кожнай эстэтычнай школы або накірунку адбываюцца працэсы асіміляцыі, дэфармацыі і трансфармацыі творчых прынцыпаў, якія былі распрацаваны мастакамі папярэдніх перыядаў. Я. Колас побач з Я. Купалам «сцвердзілі сваю, новую школу ў развіцці нацыянальнай літаратуры. Разам з празаікамі-рэалістамі М. Гарэцкім і К. Чорным. <…> Яны сталі здабыткам ужо агульнага працэсу, страцілі прыкметы індывідуальнага стылю і набылі якасці тыпалагічна вызначальных прынцыпаў. <…> І для сучаснікаў, і для наступных пакаленняў яны сталі тым жыццядайным пачаткам, які ў значнай ступені паўплываў на змест і структуру іх твораў» [9, с. 5 – 6].

Разглядаючы творчасць літаратараў у кантэксце пэўнай эпохі, гісторыка-генетычнае даследаванне адлюстроўвае «<…> рух літаратуры, змену адных літаратурных з’яў іншымі, іх узаемадзеянне і ўнутраныя супярэчнасці, ідэйную, эстэтычную барацьбу і гістарычную пераемнасць літаратурнага развіцця» [15, с. 385]. Даследуючы простыя, элементарныя сувязі (уплывы, пераклічкі тэм, сюжэтаў і вобразаў), а таксама складаныя генетычныя (апасродкаваныя) узаемадзеянні, нельга не заўважыць прыналежнасць М. Гарэцкага і К. Чорнага да беларускага рэалізму. «Абодва пісьменнікі, незаўважна для сябе, карысталіся рэалістычным падыходам у адлюстраванні народнага жыцця, трагічнага па сваёй сутнасці. Аднаўляючы жыццё ў формах самога жыцця, яны ў першую чаргу намагаліся выявіць схаваную духоўную сілу і маральную чысціню простага чалавека» [9, с. 8].

Стоячы ля вытокаў нацыянальнай рэалістычнай прозы, кожны з аўтараў зрабіў унёсак у скарбонку развіцця філасафічнасці беларускай прозы: Я. Колас – шляхам раскрыцця чалавека праз яго ўчынкі ў непарыўнай сувязі з грамадствам, побытам і прыродай; М. Гарэцкі – праз раскрыццё індывідуальнай свядомасці і яе ўзаемаадносін з грамадствам, К. Чорны – праз паказ народнай свядомасці, лёсу народа, повязі часоў.

У рэчышчы акрэсленай праблематыкі асэнсаванне філасофскага аспекту «ваеннай» аповесці ў беларускай літаратуры варта пачынаць з твораў, прысвечаных падзеям першай сусветнай вайны і белапольскай акупацыі. «Пасляваенная літаратура <…> пацвярджае старую ісціну – зварот да ваеннай тэматыкі і ваеннай праблематыкі звязаны з пастаноўкай рашаючых, галоўных праблем асабістага і нацыянальнага быцця. Прычым тут яшчэ раз <…> бачна, што і ў адносінах да такой спецыфічнай сферы рэчаіснасці, як ваенны быт і ваенныя дзеянні, жыццё і смерць на палях баёў, мастацтва адлюстроўвае адметнасць грамадскіх умоў, што спарадзілі яго, і ход ідэйнай барацьбы таго часу, калі яно ствaралася» [3, с. 11].

Пры ўсёй неаднароднасці, унутранай палеміцы пісьменнікаў (М. Гарэцкі, Я. Колас, К. Чорны), пры розніцы ў гістарычным кантэксце, значэнні і мастацкім узроўні твораў, што бяруцца намі для аналізу (адпаведна «Ціхая плынь», «На імперыялістычнай вайне», «Дрыгва», «Скіп’ёўскі лес») творы пра вайну ці выключна ваенную сітуацыю ўяўляюць сабой, умоўна кажучы, цэльнасць, адзначаную агульнымі рысамі.

Сярод родавых прыкмет, характэрных для твораў дадзенага кшталту, варта адзначыць праблему гвалтоўнай смерці, маральнага выбару героя, неаднароднасць асвятлення партызанскай тэмы. Адзначым і сюжэтныя канстанты: цяжкасць паходнага жыцця, адарванасць ад сям’і і блізкіх, шматмерная прырода подзвігу, да якога звужаюцца ніці дзеяння. Гэты тэматычны падыход цікавы для даследчыкаў, бо тэма вайны і чалавека на вайне ўяўляе сабой шырокае поле для супастаўлення. «У вядомым сэнсе слова можна сказаць, што паняцце “кніга пра вайну” валодае для сучаснага чытача пэўным сэнсам: ён ведае, што сустрэнецца ў ёй з сутнаснымі праблемамі быцця, пытаннямі жыцця і смерці ў іх рэзка драматычнай, трагічнай форме» [3, с. 18]. Вайна як матэрыял мастацкай літаратуры пастаянна «супраціўляецца метадам акадэмічнага вывучэння» [4, с. 61]. Яна не можа адысці ў мінулае, бо яе наступствы даюць пра сябе ведаць у розных праявах сучаснасці (храналагічна блізкая вайна ў Афганістане, Чачні, шматлікія ваенныя канфлікты і здарэнні). Памяць павінна жыць, каб не мець права на паўтарэнне.

М. Гарэцкі з пачатку сваёй дзейнасці ўздымаў глыбінныя пытанні чалавечага быцця і свядомасці, закранаў спектр праблем, звязаных з бытам, традыцыямі, сацыяльнымі адносінамі і гісторыяй беларусаў.

В. Локун дае дакладнае вызначэнне накірунку творчасці М. Гарэцкага і К. Чорнага: «М. Гарэцкі і К. Чорны былі стваральнікамі нацыянальнай рэалістычнай прозы, аналітычна-рэалістычнага яе накірунку (М. Гарэцкі) і рэалістычна-псіхалагічнага (К. Чорны)» [9, с. 8 – 9].

Беларуская літаратуразнаўчая навука даўно адзначыла ўплыў на творчасць М. Гарэцкага мастацкай практыкі Л. Талстога і Ф. Дастаеўскага (спасціжэнне дыялектыкі душы). Не без падстаў, аднак, гучыць і выснова А. Адамовіча адносна творчай практыкі М. Гарэцкага ў супастаўленні з вопытам А. Чэхава (наступны этап рускага рэалізму ў класічным сцвярджэнні). Рэалістычны пачатак прозы М. Гарэцкага не перашкаджае наяўнасці ў яго творчасці глыбокай філасафічнасці перш за ўсё ў абмалёўцы характару чалавека і яго быцця. Герой аўтара выступае лагічным выразнікам светаўспрымання апошняга, імкнучыся да вырашэння актуальных жыццёвых і філасофскіх праблем. Л. Гаранін акрэслівае пазіцыю пісьменніка наступным чынам: «Працягваючы рэалістычную лінію развіцця беларускай літаратуры, М. Гарэцкі ўзняў гэты рэалізм да такога ўзроўню, калі сацыяльныя, гістарычныя, маральныя, бытавыя і іншыя прыватныя праблемы жыцця апынуліся ў непарыўнай сувязі са светаўспрымальнымі, філасофскімі праблемамі» [5, с. 139].

Першая сусветная вайна падсумавала ўсе вынікі, да чаго прыйшло чалавецтва ў пытаннях вырашэння свайго быцця. Свядомая частка асэнсавала сваё гістарычнае месца ў сусвеце. Паводле М. Тычыны, «вайна дапамагла ўсвядоміць <…> не толькі нацыянальна-спецыфічнае, але і ўсеагульнае, тое, што аб'ядноўвае, надае нацыянальнай дзейнасці вышэйшы сэнс» [14, с. 25]. У выніку ў літаратуразнаўстве стаў заканамерным разгляд нацыянальных беларускіх праблем у агульнаеўрапейскім кантэксце. Трэба дадаць, што ваенныя творы М. Гарэцкага даўно заўважыла крытыка далёка за межамі Савецкага Саюза (напрыклад, Т.Н. Браран (Н. Рандаў) у былой ГДР).

Твор «Ціхая плынь» (1917 – 1930) можа быць аднесены да «ваеннай» аповесці ўскосна, бо ваенныя падзеі паказваюцца аўтарам літаральна напрыканцы. Адносячы гэты твор да жанру сацыяльна-бытавой аповесці, трэба разглядаць яго як своеасаблівы «падступ» да напісання сапраўднай кнігі пра вайну. «Ціхая плынь» упершыню апублікавана пад сімвалічным загалоўкам «За што?» у газеце «Известия Смоленского Совета…» за 1 мая 1918 года. На беларускай мове ўпершыню апублікавана пад загалоўкам «Ціхія песні» ў 1926 годзе. Пры падрыхтоўцы выдання 1930 года ў тэкст былі ўнесены стылістычныя і кампазіцыйныя папраўкі, а таксама зменена назва.

Пісьменнік адлюстроўвае недастатковае разуменне простым чалавекам усёй сур'ёзнасці і трагічнасці пачатку ваенных дзеянняў: « – Што ж вы, браццы, разляглісія тут, што бараны? Жыцця не шкада, ці што? <…> У госці прыйшлі?! А ну, жыва ў акопы… Немец наступае!..» [7, с. 197]. Несвядомасць народа тлумачыцца яго ідэйнай адсталасцю і забітасцю. М. Гарэцкі ставіць перад сабой задачу: паказаць беларускаму чалавеку, што так, як раней, жыць нельга. Галоўны герой твора Хомка ўяўляе сабой пераважную народную масу, якая несвядома ставілася да ваеннага быцця. Чалавек народжаны для таго, каб жыць, існаваць тут і зараз. Смерць падаецца М. Гарэцкім як несапраўднае быццё, як знешні фактар, што разбурае гармонію чалавечага існавання. Малады хлопец недарэчна гіне, задаючы чалавецтву зусім не рытарычнае пытанне: «За што? Шэпча ён усё цішэй і цішэй. Вострая крыўда, роспач разрывае сэрца» [7, с. 198].

Адзначаючы значэнне дадзенага твора ў мастацка-філасофскім кантэксце пошукаў праўды пра ваеннае быццё, варта прыгадаць выказванне І. Чыгрына: «Што Максім Гарэцкі адкрыў? <…> Праўду пра свой народ. Парадаксальна, але так: пішучы пра вайну, якую вядуць арміі дзвюх імперый, стварыў праўдзівыя творы пра ўласны народ» [17, с. 69].

Дакументальна-мастацкая кніга «На імперыялістычнай вайне. Запіскі салдата 2-й батарэі N-скай артылерыйскай брыгады Лявона Задумы» (1914 – 1915, 1919) займае асобае месца не толькі ў гісторыі беларускай, але і ў гісторыі сусветнай літаратуры. Упершыню твор выйшаў асобным выданнем у 1926 годзе. Кніга з'яўляецца прынцыпова новым этапам у развіцці ідэйнай пазіцыі М. Гарэцкага. Па-першае, яна ўяўляе сабой дакумент (мае форму мемуарных запісаў), што пераканаўча агаляе праўду вайны. Такая крытычна-рэалістычная, «аб'ектывавана-дакументальная» абмалёўка ваенных падзей, кажучы пра традыцыі і літаратурныя сувязі, знойдзе лагічны працяг у творчасці В. Быкава. Па-другое, твор фіксуе самыя патаемныя зрухі чалавечай душы (псіхалагічны стан не толькі шэраговага ўдзельніка вайны – салдата, але і масы людзей).

М. Гарэцкі пераходзіць да канкрэтна-гістарычнага, палітычнага і сацыяльнага аналізу падзей. З глыбокай псіхалагічнасцю і філасафічнасцю пісьменнік паказвае працэс маральнага перараджэння простага чалавека пад уплывам ваеннага быцця. У пачатку аповесці мы бачым летуценнага маладога чалавека, які не ўяўляе жахаў ваеннай рэчаіснасці: «Я спачатку не мог сабрацца з думкамі, <…> але неяк раптоўна ўзрадаваўся, <…> што жыццё пойдзе ўжо больш цікава, што я лоўка трапіў у гэтую кашу» [7, с. 208]. Паступова становіцца відавочны кошт гэтага перараджэння: «Што было ўчора? Я жывы, але былога мяне назаўсёды няма» [7, с. 228].

Такое перараджэнне праходзіць шэраг этапаў: непаразуменне, страх, абыякавасць, атупенне, усведамленне. Спачатку аўтарскі герой Лявон Задума нічым не адрозніваецца ад маладога, неабстралянага свайго папярэдніка Хомкі з узгаданай аповесці. У Лявона, як і ў астатняй людской масы, адсутнічае адэк-

ватнае ўяўленне пра характар такой падзеі, як вайна: «Усе ажыўлена-весела, але і крыху трывожна азіраюцца. Усім цікава» [7, с. 220]. Пасля ўбачаных першых абстраляных, параненых на змену цікавасці прыходзіць заканамернае пачуццё страху за асабістае жыццё: «Я баюся… Я нічога не бачу праз запыленае з вонкавага боку ваконца. Загіну без усялякай карысці» [7, с. 228]. На наступнай стадыі звычайны чалавек бачыць смерць ва ўсёй яе падкрэслена пачварнай, натуральнай праяве. Ён пачынае задумвацца пра несапраўднасць і антычалавечнасць ваеннага быцця, у якім смерць выступае як натуральная з'ява: «Забіты чалавек. Што тут асаблівага? <…> Духоўнага безабраззя ва ўсёй глыбіні адчуць не магу. Атупеў» [7, с. 268]. І нарэшце, пасля ўласнага ранення, перажытых пакут – заканамернае філасофскае разважанне пра сэнс (дакладней, недарэчнасць) чалавечага жыцця ва ўмовах ваеннай рэчаіснасці: «І нашто ўсё гэта? І што ж гэта такое? Жыў чалавек – і памірае. Проста ўсё. І няма нічога вышэйшага… І вечная загадка» [7, с. 308].

Як чалавек свядомы, Лявон Задума назірае за стварэннем ваенных міфаў пра гераізм чалавека на вайне, збянтэжана разважаючы над сапраўднай яго сутнасцю, супрацьпастаўляючы свае назіранні ідэалагічным догмам. Ужо з часоў першай сусветнай вайны, белапольскай акупацыі, пасля ў Вялікую Айчынную вайну міфы гэтыя ствараліся кіраўніцтвам дзеля ідэалагічна-прапагандысцкай мэты. У выніку асэнсаваных філасофскіх назіранняў за акаляючай рэчаіснасцю, маральнай хлуснёй, чалавечай дэградацыяй прыходзіць разуменне антычалавечага і бязмэтнага пачатку вайны, безабароненасці яе ўдзельнікаў перад тварам смерці і разам з тым душэўная стомленасць: «І я – кузурка, і ўсе мы – кузуркі» [7, с. 259]; «Ну і чорт яго бяры, такое жыццё, – не шкада. <…> А наогул – усё нядобра, мярзотна, цяжка…» [7, с. 324].

Герой М. Гарэцкага імкнецца да маральнай чысціні і праўды, атаясамліваючы сябе ў несвядомай людской масе. Лявон Задума марыць пра лепшы для беларускай нацыі лёс: «І больна сэрцу, што Беларусь, у параўнанні, дзікая-дзікая!» [7, с. 226]. Пра М. Гарэцкага і яго героя І. Чыгрын піша так: «Усяго сябе аддаў таму, каб узвысіцца над трагічнай, здавалася б, складанасцю сітуацыі. Сярод празаікаў-сучаснікаў адразу вылучыўся тым, што звярнуўся <…> да мастацкага ўзнаўлення новых пластоў з жыцця беларускага народа, упершыню зрабіўшы героем сваіх твораў нязнанага да таго маладога чалавека, беларуса-адраджэнца, <…> г. зн. вызначыўся канкрэтнай задачай, якую паставіў перад сабой як творца» [17, с. 30 – 31].

Падыходзячы да філасофскага аспекту адлюстравання ваеннай рэчаіснасці ў творчасці Я. Коласа (аповесць «Дрыгва»), прыгадаем, што твор напісаны ў 1932 – 1933 гадах, надрукаваны ў 1933 годзе. Аповесць заснаваная на рэальных фактах, апісвае падзеі часоў белапольскай акупацыі часткі тэрыторыі Беларусі ў 1919 – 1920 гадах. Цэнтральны вобраз у творы – просты беларускі селянін дзед Талаш. У свае ўжо немаладыя гады ён далучыўся да рэвалюцыйнай барацьбы, узначаліў партызанскі атрад, які ваяваў супраць польскіх войск на Палессі. М. Тычына зазначае: «Не дзіўна, што менавіта Колас у подзвігу палешука-партызана 70-гадовага дзеда Талаша ўбачыў высокі прыклад сапраўдных народных адносін да вызваленчай вайны з белапалякамі. Дзед Талаш – выразнік народных адносін да вайны» [13, с. 105]. Аповесць Я. Коласа характарызуецца, з аднаго боку, прастатой пачатковай прозы, з другога – філасафічнасцю абагульненняў, псіхалагічным і сацыяльным аналізам фактаў. Ад увагі да быту і этнаграфічных асаблівасцяў аўтар пераходзіць да шырокіх філасофскіх абагульненняў і сацыяльнага асэнсавання рэчаіснасці. Такі пераход яскрава прасочваецца на прыкладзе вобраза галоўнага героя. «Чалавек, канцэпцыя чалавека, як яны ўвасоблены ў мастацкім характары, – асноўнае ў творчасці Я. Коласа, што вызначае ўзровень мастацкай свядомасці народа і сацыяльны духоўны стан грамадства, якое ўзнялося на барацьбу за свае сацыяльныя і нацыянальныя інтарэсы» [2, с. 9]. І свет, і чалавек падаюцца ў Я. Коласа ў форме «аб'екту сузірання», гэта значыць, аўтар перш за ўсё ў сваёй паэтыцы апісальны, а ўжо пасля – філасафічны. Такім чынам, унутраны свет чалавека падаецца праз знешнія праяўленні.

«Творчасць пісьменніка можна глыбока зразумець, толькі суаднёсшы яе з гісторыка-літаратурным працэсам, а не толькі з літаратурай яго часу. Бо ён, мастак, узрастае <…> на адпаведнай грамадска-сацыяльнай і эстэтычнай глебе» [2, с. 5]. Даследчыкі вызначаюць жанр «Дрыгвы» наступным чынам: юнацкая ці гісторыка-рэвалюцыйная аповесць. У 20 – 30-я гады XX стагоддзя на матэрыяле грамадзянскай вайны стваралася нямала твораў, што па сюжэце нагадвалі прыгодніцкія творы. Некаторымі рысамі «Дрыгва» нагадвае аповесці такога кшталту (дэтэктыўныя сюжэтныя лініі, у прыватнасці, уцёкі дзеда Талаша ад легіянераў; Марціна Рыля – з панскай няволі і інш.). Некаторыя эпізоды аповесці (напрыклад, апісанне батальных сцэн барацьбы партызан, уцёкі галоўных герояў і інш.) маюць ярка выражаны рамантызаваны падтэкст, характэрны для твораў адзначанага жанру. «Рамантычнай філасофіі ўласцівая форма <…> фрагментаў. <…> Фрагментарны стыль (метад, форма) <…> дазволіў <…> спасцігнуць паўнату і канкрэтнасць жыцця, рэчаіснасці і выразіць яе ў згорнутым, скарочаным, зашыфраваным выглядзе <…>» [4, с. 5 – 6]. Менавіта таму некаторыя эпізоды аповесці выглядаюць схематычнымі, недастаткова пераканаўчымі.

Кажучы пра міф як адну з форм рамантычнага светаўспрымання, нельга не адзначыць у аповесці Я. Коласа традыцыйнае для 20 – 30-х гадоў XX стагоддзя зараджэнне так званых савецкіх міфаў, у якіх рэчаіснасць ідэалізуецца і паказваецца недастаткова аб'ектыўна. Уласна кажучы, адбываецца падмена каштоўнасцей, рэстаўрацыя прыярытэтаў, накіраваныя на стварэнне новага міфа.

Метад сацыялістычнага рэалізму, які паклаў адбітак на творчасць Я. Коласа, спрыяў наяўнасці ў аповесці «Дрыгва» пафасу рамантычнай акрыленасці, упэўненасці ў дасягненні мэт, якія не дэтэрмінаваліся рэальнасцю. Усё адзначанае прывяло да сцвярджэння ідэальнага пачатку ў быцці (так званая вера ў лепшае будучае).

Нягледзячы на ўяўную прастату і дэтэктыўна-рамантычны сюжэт, аповесць не пазбаўленая філасафічнасці. Філасофскім у аповесці падаецца і матыў унутранага пераўтварэння дзеда Талаша з фігуры даволі несвядомай у асобу, якая падтрымлівае новы лад жыцця, разбіраючыся ў яго калізіях. Наогул, пераўтварэнне « <…> іграе вялікую ролю ў жыцці чалавека. Гэта функцыя яго быцця» [8, с. 162]. Аднак пераўтварэнне галоўнага героя ў дадзенай аповесці – крыху іншага кшталту, чым у М. Гарэцкага, бо можна паставіць пад сумненне акалічнасць даволі непрацяглага пераасэнсавання і новага ўспрымання рэчаіснасці такім сталым чалавекам, як дзед Талаш.

І. Навуменка дае наступнае вызначэнне аповесці: «“Дрыгва” – твор высокапаэтычны, наскрозь прасякнуты мудрай народнай усмешкай, дасціпнай разважнасцю, лірычнасцю» [11, с. 186]. Сапраўды, такімі паўстаюць эпізоды, у якіх апавядаецца пра ўзаемаадносіны людзей, каханне.

Вельмі дакладна характарызуе творчую палітру пісьменніка А. Адамовіч: «Як у вялікага Пушкіна, кожны твор Я. Коласа, акрамя канкрэтнай ідэі, заключае ў сабе і агульную філасофскую думку аб багацці і невычарпальнасці форм і праяўленняў жыцця. Незвычайная гармонія думкі і пачуцця, уменне паказаць, зберагчы жыццёвыя прапорцыі – вось што характарызуе лепшыя творы Я. Коласа» [1, с. 13]. Працягваючы гаворку пра традыцыі ў літаратурнай практыцы, якія відавочныя ў сэнсе тыпалагічных параўнанняў, несумненым сцвердзім той факт, што аповесць «Дрыгва» побач з «Новай зямлёй» і першымі дзвюма кнігамі трылогіі «На ростанях» з’явілася вытокам станаўлення новай беларускай прозы, дала апошняй штуршок і далейшае развіццё, заклала «<…> асноўныя плацдармы, з якіх беларуская проза рушыла на заваёвы новых мастацкіх рубяжоў» [11, с. 202].

Можна сцвярджаць, што з пералічаных твораў бярэ пачатак і лірычная, і псіхалагічная беларуская проза. Гэтыя два пачаткі афарміліся ў самастойныя жанравыя плыні. Апошнюю плённа працягнуў К. Чорны, перадаўшы наступным пакаленням свой вопыт і майстэрства, бо на падставе твораў аўтара вырасла пакаленне аўтараў, такіх як І. Шамякін, Я. Брыль, І. Мележ, В. Быкаў, П. Пестрак, А. Кулакоўскі, А. Васілевіч і інш.

Цэлую галерэю народных характараў намаляваў Я. Колас. Па словах М. Тычыны, «Яго вабяць да сябе людзі з шырокім поглядам на жыццё, якія востра чуюць подых яго прастораў» [14, с. 23]. Вобраз дзеда Талаша выклікаў з’яўленне народных характараў у творах іншых беларускіх пісьменнікаў. Так, у драме «Партызаны» К. Крапіва малюе вобраз дзеда Бадыля; у рамане Э. Самуйлёнка «Будучыня» раскрыты вобраз старога Тапурыя. Такім чынам, найбольш прыкметны ўплыў Я. Коласа на сучаснае яму і наступнае літаратурнае развіццё ляжыць, па словах І. Навуменкі, «у рэчышчы ідэйным, у самім падыходзе вялікага пісьменніка да жыцця, у бачанні яго і адчуванні. Колас першы давёў шматграннасць душы простага чалавека, першы даў адчуць шматмільёнаму чытачу, якая прыгожая, багатая, разнастайная сваімі праявамі беларуская зямля і прырода. Ён першы стварыў буйныя нацыянальныя характары, і ўсе нашы далейшыя дарогі – ад гэтага» [11, с. 206].

Падсумоўваючы сказанае, варта адзначыць у творчасці Я. Коласа свабоду і цэласнасць мастацка-філасофскага светаўспрымання, а таксама сувязь рамантычнай традыцыі з рацыяналістычнай думкай і аналітызмам.

Кузьма Чорны сваёй творчасцю адлюстраваў гістарычны этап адраджэння не толькі нацыі, але і змянення псіхалогіі, свядомасці кожнага чалавека. Л. Гаранін падкрэслівае літаратурную сувязь аўтара з рускай савецкай класікай (у прыватнасці, М. Горкім), бо асноўныя вехі творчага шляху беларускага класіка супалі з гадамі савецкага этапу ў развіцці літаратуры і культуры. М. Тычына зазначае: «Паміж біяграфіяй К. Чорнага і яго творамі цяжка праводзіць прамыя паралелі» [12, с. 11]. Кузьма Чорны быў актыўным удзельнікам арганізацыі «Маладняк», што ўзнікла ў канцы 1923 года. У сваіх першых творах малады аўтар імкнуўся адлюстраваць прыход усяго новага, звязанага з рэвалюцыяй 1917 года, у жыццё, быт і свядомасць людзей. Шлях аўтара ад паэтычнай да псіхалагічнай прозы з’явіўся імкненнем пераадолець схематызм у паказе чалавека. Менавіта таму да праблемы «жывога чалавека» пісьменнік звярнуўся ў сярэдзіне 20-х гадоў ХХ стагоддзя і няспынна займаўся ёй да канца свайго жыцця. Найбольш блізкім класіку стаў псіхалагізм твораў Л. Талстога.

Адна з нашых задач – аналіз філасофскага аспекту «ваеннай» аповесці аўтара, таму падаецца магчымым засяродзіць увагу на творы «Скіп’ёўскі лес» (1941 – 1944). Аповесць з’яўляецца яскравым падмуркам адлюстравання аўтарскіх пазіцый. Адзнакай сапраўднага рэалізму пісьменнік лічыў канкрэтна-гістарычны падыход да з’яў рэчаіснасці, які стаў адным з галоўных крытэрыяў творчасці аўтара. «У цэлым пісьменнік настойліва і паслядоўна рухаўся да эпічнага сінтэзу эпохі <…> разам са сваімі сучаснікамі Я. Коласам, Ц. Гартным, М. Гарэцкім, М. Зарэцкім, П. Галавачом і іншымі <…>» [12, с. 97].

Эпічны талент пісьменніка найбольш яскрава праявіўся ў творах перыяду Вялікай Айчыннай вайны. Звяртаючыся да нясконачанай аповесці «Скіп’ёўскі лес», адзначым уменне аўтара перадаць канкрэтныя

з'явы рэчаіснасці, а таксама багацце ўнутранага свету чалавека. Нездарма ў творы прысутнічаюць вельмі дакладныя і падрабязныя апісанні знешніх і ўнутраных якасцей герояў: «Марцін Прыбыткоўскі быў яшчэ зусім малады чалавек, высокі, хударлявы, невялікі ахвотнік да слова і нядаўна жанаты. Жонка яго тады вельмі была падобная да дзяўчынкі. Зусім маладая, вельмі рухавая, нават трапяткая <…>» [16, с. 405].

Вельмі дакладна К. Чорны спалучаў перадачу ўнутраных прычын і жыццёвых з'яў, раскрываў значэнне кожнага чалавека ў гістарычным працэсе. Кожны элемент яго мастацкага апавядання падпарадкоўваецца асноўнай задачы – паказу простага чалавека ва ўмовах мірнага і ваеннага быцця.

Аповесць «Скіп'ёўскі лес» варта разглядаць як частку вялікага эпічнага палатна, прысвечанага ваеннай тэматыцы. М. Тычына канстатуе: «Звязаныя агульным момантам нараджэння, адзінай фактычнай асновай, пранізаныя пачуццямі патрыятызму і гуманізму, яны [творы] успрымаюцца як маналог пісьменніка аб часе і аб сабе» [12, с. 102]. Задума аповесці ўзнікла ў гады вайны паралельна з працай над напісаннем раманаў ваеннай тэматыкі («Пошукі будучыні», «Млечны шлях», «Вялікі дзень», 1941 – 1944): твор з'яўляецца арганічным працягам трылогіі. У аповесці свет чалавека сінтэзуецца з непаўторным светам беларускай прыроды. Пейзажы нясуць філасофскае напаўненне, кантрастуючы з несапраўдным быццём, – фашысцкай навалай: «Усе дваццаць дзве хаты Скіп'ёўскага Пераброддзя паабрасталі вішняком і арабіннікам. За хатамі спеюць улетку антонаўкі, папяроўкі і слуцкія бэры, і да самых замаразкаў вісяць у голлі чырванабокія «цыганкі». Да самых маразоў пад вокнамі цвіце бабіна лета» [16, с. 404].

Трэба заўважыць, што К. Чорны, не маючы пачуццёвага вопыту Вялікай Айчыннай вайны, ствараў ваенныя творы пры дапамозе экстрапаляцыі вопыту, набытага ва ўмовах першай сусветнай. У імкненні да філасофскага асэнсавання падзей быцця пісьменнік звяртаўся да гісторыі біяграфічных дадзеных герояў. Дадзеная акалічнасць вяла да пэўнай умоўнасці сюжэта, да скарачэння сюжэтных ліній і фактаграфізму.

Па словах М. Тычыны, К. Чорны імкнуўся «перш за ўсё да філасофска-мастацкага асэнсавання падзей» [12, с. 125]. Пісьменнік паказаў жыццё па-філасофску: з усёй палітрай пахаў і гукаў: «Усюды крычаць гусі і крэкчуць качкі. Спяваюць аж разлягаюцца пеўні. <…> Вяндлярны дым на добрыя тры месяцы на год перабівае пах смалы <…>» [16, с. 404]. Па словах аўтара: «Чалавек – гэта цэлы свет». Гэта і эстэтычная, і філасофская канцэпцыя падыходу да праблем чалавека і яго быцця. Ствараючы вобраз пэўнага героя, аўтар уводзіў яго ў кантэкст гісторыі, рабіў часцінкай грамадства, прымушаючы задумвацца над лёсам сваёй дзяржавы. Філасофскія праблемы арганічна выцякаюць са створанай пісьменнікам сістэмы вобразаў. Над сэнсам быцця, лёсам сваёй краіны думае ўжо сам герой-беларус. Вайна паказана ў тых праявах і рамках, у якіх патрэбна для ілюстрацыі ходу змяненняў у характары героя. С. Андраюк піша: «Даследуючы чалавека, глыбока пранікаючы ў яго сутнасць, суадносячы яго з глабальнымі праблемамі чалавечага быцця, Чорны заўжды ішоў ад вельмі рэальнай, ім асабіста пазнанай сацыяльна-бытавой асновы» [2, с. 39].

Душэўная работа, якая адбываецца ў літаратурным героі К. Чорнага, сведчыць пра аналітычны партрэт кожнай адлюстраванай аўтарам асобы. Гэта рыса стала дамінантнай у творах пра Вялікую Айчынную вайну. Такім чынам, пісьменнік паказаў беларуса не толькі ў сацыяльна-гістарычным, але і ў філасофска-псіхалагічным плане. У творах ваеннай тэматыкі выразна адчуваецца багацце вопыту, назапашанага аўтарам у 20 – 30-я гады. Быццё – макракосм, які складаецца з мікракосмаў – жыццяў асобных людзей. Героі К. Чорнага ў большасці сваёй – жыццялюбы і альтруісты. Напрыклад, Кастусь Прыбыткоўскі з аповесці «Скіп'ёўскі лес» вельмі тонка ўспрымае межы жыцця і смерці: «Кастусь Прыбыткоўскі ў гэты апошні момант меў адчуванне, падобнае да адчування смертніка, які ведае, што сваёй смерцю ён выратуе тых, хто яму даражэй за ўласнае жыццё» [16, с. 439].

Цікавым падаецца факт апісання псіхічнага стану галоўнага героя пасля забойства немца. Калі ў М. Гарэцкага Лявон Задума з гэтай нагоды адчувае агіду, дык у К. Чорнага Кастусь Прыбыткоўскі ўсведамляе нянавісць да ворага, загартоўваючы сябе дзеля змагання. У гэтым бачыцца працяг заходняй класічнай традыцыі адлюстравання ваенных падзей, дзе вайна з'яўляецца натуральным станам мужчыны. Чалавек – частка народа і чалавецтва, а яго лёс – частка агульнанароднага лёсу.

Такім чынам, К. Чорны сваёй творчасцю вызначыў у развіцці нацыянальнай літаратуры цэлую філасофска-аналітычную плынь, узняў яе на новую мастацкую ступень, надаў ёй якасці і тэндэнцыі літаратуры сусветнага значэння і гучання, стварыўшы ўласную мастацкую канцэпцыю народа. Па словах А. Адамовіча, «Працуючы ў канцы вайны над раманамі "Пошукі будучыні", "Млечны шлях", "Вялікі дзень" і над аповесцю "Скіп'ёўскі лес", пісьменнік папярэдзіў у многім аблічча будучай літаратуры пра вайну. К. Чорны быў адным з першых савецкіх празаікаў, які паказаў фашыста не проста як істоту, што перакаsuccessfulалася ў поспеху ваеннага рабаўніцтва, а як псіхалагічнае і маральна спароджанае пэўнымі грамадскімі тэндэнцыямі» [1, с. 51].

**Заключэнне.** Філасофскія пошукі беларускіх пісьменнікаў характарызуюцца сувяззю з праблемамі часу і задачамі развіцця літаратуры. Найбольшае развіццё мастацка-філасофская думка атрымала ў тых выпадках, калі цесным чынам была звязана з надзённымі праблемамі быцця і чалавечай асобы. Дзейнасць М. Гарэцкага, Я. Коласа пачынае новы этап філасофскіх пошукаў, асэнсоўваючы гістарычныя па-

дзеі і месца чалавека ў іх. Згаданая праблема глыбока раскрыта ў творчай спадчыне К. Чорнага. Цікавасць беларускай ваеннай прозы да філасофіі быцця і псіхалогіі чалавека была выклікана патрэбай у новым падыходзе да асвятлення ваеннай тэматыкі. Дадзеныя аўтары заклалі падмурак для фармавання традыцый ваеннай прозы, якія атрымалі лагічны працяг у сучаснай беларускай літаратуры ў выглядзе фактаў духоўных пісьменніцкіх пошукаў, звязаных з аналізам сацыяльнай прыроды чалавека і перспектыў яго будучага існавання.

ЛІТАРАТУРА


1. Адамовіч, А. Літаратура, мы і час: Артыкулы і выступленні / А. Адамовіч. – Мінск: Маст. літ., 1979. – 384 с.
2. Андраюк, С.А. Пісьменнікі. Кнігі / С.А. Андраюк. – Мінск: Маст. літ., 1997. – 318 с.
3. Вторая мировая война в литературе зарубежных стран / П.М. Топер [и др.]; под общ. ред. П.М. Топера. – М.: Наука, 1985. – 616 с.
4. Габитова, Р.М. Философия немецкого романтизма / Р.М. Габитова. – М.: Наука, 1978.
5. Гаранин, Л.Я. Философские искания в белорусской литературе / Л.Я. Гаранин. – Минск: Наука и техника, 1984. – 222 с.
6. Гісторыя беларускай літаратуры ХХ стагоддзя: у 4 т. / рэдкал.: У.В. Гніламёдаў, С.С. Лаўшук (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск: Беларуская навука, 2004. – Т. 4, кн. 1: 1966 – 1985 / У.В. Гніламёдаў [і інш.]. – 2004. – 928 с.
7. Горецкий, М. Избранное / М. Горецкий. – Минск: Мастацкая літаратура, 1989. – 544 с.
8. Докучаев, И.И. Ценность и экзистенция. Основоположения исторической аксиологии культуры / И.И. Докучаев. – СПб.: Наука, 2009. – 595 с.
9. Локун, В.І. Васіль Быкаў у кантэксце сусветнай літаратуры / В.І. Локун. – Мінск:Тэхнапрынт, 2005. – 228 с.
10. Локун, В.І. Маральна-філасофскія пошукі беларускай ваеннай і гістарычнай прозы: 1950 – 1960-я гг. / В.І. Локун. – Мінск: Навука і тэхніка, 1995. – 109 с.
11. Навуменка, І. Якуб Колас: нарыс жыцця і творчасці / І. Навуменка. – 2-е выд. – Мінск: Народная асвета, 2003. – 207 с.
12. Тычына, М. Кузьма Чорны: эвалюцыя мастацкага мыслення / М. Тычына. – Мінск: Беларус. навука, 2004. – 168 с.
13. Тычына, М. Народ і вайна / М. Тычына. – Мінск: Навука і тэхніка, 1985. – 327 с.
14. Тычына, М. Час прозы: літаратурна-крытычныя артыкулы / М. Тычына. – Мінск: Маст. літ., 1988. – 206 с.
15. Храпченко, М.Б. Пути историко-литературных исследований: собр. соч.: в 4 т. / М.Б. Храпченко. – М., 1982. – Т. 4 .
16. Чорны, К. Збор твораў: у 6 т. / К. Чорны. – Мінск: Маст. літ., 1992. – Т. 6: Раманы, аповесці. – 464 с.
17. Чыгрын, І.П. Паміж былым і будучым: проза Максіма Гарэцкага / І.П. Чыгрын. – Мінск: Навука і тэхніка, 1994. – 167 с.


*Пастуміў 26.02.2010*

**PHILOSOPHIC MOTIVES OF EXISTENCE IN THE CONTEXT OF BELARUSIAN “WAR” SHORT NOVEL (M. GARETSKY, Y. KOLAS, K. CHORNY)**

***T. BAGARADAVA***

*The article deals with philosophic motives of existence in the context of Belarusian literature (on the basis of the ‘war’ short novels by M. Garetsky, Y. Kolas, K. Chorny). The research is predetermined by the lack of works devoted to philosophic motives of existence and some ideological peculiarities in literary works by some authors (M. Garetsky, for instance). It is necessary to study this issue in the context of thorough analysis of the main problems of existence. The author reviews some works connected with the topic under research. The article is based on comparative and typological analysis. The subject under analysis is literary-philosophic thought determined by the writers’ practice. A general survey of tendencies which gave rise to the Belarusian “war” short novel is carried out. Modern Belarusian literature continues the research of war themes. The following article is of current interest as it deals with the prospect of human existence.*